**Каралёў, В.** Пісьменнасць. Адукацыя / В. Каралёў // Міёрскія навіны. – 2003. – 16 снеж.– С. 3 ; 20 снеж. – С. 2 ; 23 снеж. – С. 4 ; 27 снеж. – С. 4.

## ПІСЬМЕННАСЦЬ. АДУКАЦЫЯ

Міёршчына і Дзісеншчына не могуць пахваліцца такімі старажытнымі сведчаннямі пісьменнасці насельніцтва, як суседняя Браслаўшчына з яе археалагічнымі знаходкамі – больш 100 рунічных надпісаў на касці, пакінутых яшчэ вікінгамі на гарадзішчы Маскавічы да сярэдзіны XIII стагоддзя. У тыя часы наша мясцовасць уяўляла глыбокую перыферыю з нешматлікімі і невялікімі паселішчамі. А ў недалёкім Полацку, дзякуючы падзвіжніцкай працы ігуменні Ефрасінні, з сярэдзіны XII стагоддзя атрымалі развіццё перапісванне кніг, рэлігійная адукацыя.




З 1380 года першыя выхадцы з Вялікага княства Літоўскага ўжо вучыліся ў Пражскім, а з 1400-га – у Кракаўскім універсітэтах. Згодна ўстаўной граматы Полацку з пачатку 1390-х гадоў людзі ўсіх саслоўяў полацкай зямлі атрымалі права вольнага выезду за мяжу. Згодна прывілея Казіміра ад 1447 года такое ж права набылі князі, паны і баяры асноўнай часткі княства, што спрыяла набыццю ліцвінамі вышэйшай адукацыі ў Польшчы, Чэхіі, Германіі, Італіі і іншых заходнееўрапейскіх краінах. Адукаваныя людзі спрыялі палітычна-эканамічнаму і культурна-адукацыйнаму ўздыму краіны ў XV–XVI стагоддзях.

Да нашых мясцін даходзілі толькі водгукі змен. Тэрыторыю сучаснага раёна ў XVI стагоддзі складалі памежныя воласці Полацкага і войтаўства Браслаўскага павета Віленскага ваяводстваў. Тым не менш агульны ўздым адбіўся на ўкладзе жыцця і тут. Існаванне 18 маёнткаў, 8 валасных і войтаўскіх адміністрацыйных адзінак, Дзісенскага намесніцтва, трох мястэчак патрабавала хаця б ад адзінак элементарных ведаў для вядзення справаводства, напісання скарг. Дзейнасць праваслаўных цэркваў у Дзісне, Язне, Галомысле і ў Навалацы, а магчыма і ў іншых населеных пунктах сведчыць пра тое, што некалькі чалавек мелі пачатковую духоўную адукацыю, хаця ўзровень яе выклікае пытанні. Згодна даследванняў Н. М. Нікольскага ў суседнім Маскоўскім княстве, на Наўгародчыне і Пскоўшчыне прыходскі клір у пераважнай большасці меў самы мінімум неабходных ведаў, бо ў час вучэння інфармацыя ўспрымалася «на слых», а цэрквы нават у гарадах адчувалі недахоп такіх рэдкіх і каштоўных тады кніг.

Трэба меркаваць, што ў XVI стагоддзі становішча ў Вялікім княстве Літоўскім было крыху лепшым, дзякуючы плённай дзейнасці нашага слыннага першадрукара Ф. Скарыны і яго паслядоўнікаў.

Лівонская вайна і звязанае з ёй узнікненне Дзісны як значнага эканамічнага цэнтра далі штуршок пашырэнню адукацыі і павелічэнню колькасці адукаваных людзей. Ужо згодна каралеўскага прывілею 1569 года ад дзісенскіх ландвойта, бурмістраў, лаўнікаў патрабавалася разуменне магдэбургскага права, веданне судовай справы, справаводства і гарадской бухгалтэрыі. Зразумела, такіх людзей з асяроддзя збеглых з Полацка мяшчан знайсці было не цяжка.

Адным з адукаванейшых людзей быў Баркулаб Корсак, а да першых пісьмовых дакументаў, створаных менавіта ў Дзісне і на Міёршчыне ўвогуле, трэба аднесці гарадскія кнігі Дзісенскага замка 1585 года. У той час былі створаны і першыя ў нашай мясцовасці помнікі эпісталярнага

жанру – лісты Стэфана Баторыя да Івана IV, лісты Замойскага (1579 г.). Супаставіўшы даты, можна меркаваць, што менавіта ў Дзісне 12 ліпеня 1579 года ў паходнай каралеўскай друкарні быў выдадзены Баторыеў «Універсал да войска».

А тым часам у краіне ў сферы адукацыі і пісьменнасці пастуова адбываліся значныя перамены. Развіваліся брацкія праваслаўныя школы – бліжэйшыя да нас Полацкая і Віленская. Бесперапынна вялося кнігадрукаванне.

У 1570 годзе ў Вільні, а ў 1581-м у Полацку адкрыліся езуіцкія калегіумы, якія на той час давалі адукацыю не горшую за ўніверсітэцкую. Так, у Полацкім калегіуме шасцігадовае аддзяленне мела 5 класаў. Вывучалі граматыку, сінтаксіс, паэтыку, рыторыку. Вялікая ўвага надавалася авалодванню лацінскай і грэчаскай мовамі. У трохгадовым вышэйшым аддзяленні атрымлівалі паглыбленыя веды па філасофіі, гісторыі, геаграфіі, пазней па логіцы і фізіцы.

Віленскі калегіум у 1579 годзе набыў статус акадэміі, меў два факультэты – багаслоўскі і філасофскі, а з 1641 года і трэці – юрыдычны. Яго правы як у Кракаўскім універсітэце, у тым ліку прысвойваць навуковыя ступені. У акадэміі працавала 8–12 прафесараў і вучылася 700–800 студэнтаў. У хуткім часе ў Вільні адкрылася яшчэ адна акадэмія – Грыгарыянская.

Нават з улікам непрыхільнага стаўлення праваслаўнай грамады да калегіумаў і ўсіх недахопаў тагачаснага езуіцкага выхавання многія прадстаўнікі заможных праваслаўных родаў аддавалі сваіх сыноў менавіта ў калегіумы, бо адчувалі іх перавагу перад іншымі школамі. У езуіцкія калегіі прымаліся хлопчыкі незалежна ад веравызнання і саслоўя. Шмат было з мяшчанскіх, нават сялянскіх сем'яў. Адукацыя была бясплатнай.

У Віленскай акадэміі працавала шмат выдатных вучоных у розных галінах ведаў, сярод якіх і «бацька фізікі ў Літве» Юзаф Міцкевіч. Акадэмія дала цэлую плеяду вядомых філосафаў, тэолагаў, гісторыкаў, пісьменнікаў, правазнаўцаў, публіцыстаў.

Увогуле каталіцкая царква і яе фундатары надавалі вялікае значэнне развіццю адукацыі. Так, для забеспячэння падрыхтоўкі настаўнікаў-кантараў для парафіяльных школ пры касцёлах у Іказні і Пагосце Леў Сапега запісаў у 1596 годзе за гэтымі касцёламі вёску Мілавічы з застенкамі (9 валок) і вёску Шукеловічы з засценкамі (12 валок), якія былі прызначаны на ўтрыманне вікарных і кантараў. Праўда, невядома, ці распачалі гэтыя школкі сваю дзейнасць пры касцёлах. (Школа ў Іказні днямі адзначыла 410-годдзе. – *Рэд.)*

У сувязі з пашырэннем і паглыбленнем інтэграцыі з Польшчай падчас знаходжання Вялікага княства Літоўскага з ёй у адной дзяржаве амаль поўным пераходам шляхты ў каталіцызм і распаўсюджаннем польскамоўнай адукацыі ў асяроддзі праваслаўнага мяшчанства беларуская мова на працягу XVII стагоддзя страціла свае пазіцыі ў кнігадрукаванні, паўсядзённым ужытку ў вышэйшых слаях грамадства. У 1696 годзе справаводства пачалі весці на польскай мове. У XVIII стагодзі беларуская мова яшчэ выкарыстоўвалася ўніяцкай царквой дзякуючы яе непарыўнай сувязі з сялянствам, за што ў наступным стагоддзі часта называлі ўніяцкай мовай. Шматлікія творы і працы на беларускай мове ў гэты час пісаліся і друкаваліся лацінскім шрыфтам.

Узнікненне першых школ у нашай мясцовасці звязана з распараджэннем біскупа Бжастоўскага (1710 г.) пробашчам наймаць здольных для навучання дзяцей бакалаўраў. Ужо ў 1719 годзе дзейнічала пачатковая школа пры кляштары дамініканаў у Друі. Дзякуючы такім школкам, пачала павялічвацца колькасць адукаванага насельніцтва, выхадцаў са шляхты і мяшчан. Так, на адным з актаў Браслаўскага павета 1787 года з агульнай колькасці 362 шляхцічаў

паставілі свае подпісы 226, а крыжыкі за мест подпісаў толькі 136. Зазначу, што некаторыя людзі ведалі польскую, беларускую і стараславянскую мовы, але прыярытэт пры пісьме належыў польскай. На ёй быў напісаны рэестр членаў праваслаўнага брацтва Дзісенскай Уваскрашэнскай царквы. Нават надпіс на зробленным у 1774 годзе срэбным акладзе да вельмі шануемага ў Дзісне абраза Маці Божай Адзігітрыі выкананы па-польску.

Ужо ў 1775 годзе ў Дзісне існавала невялікая школа (10–20 вучняў). Наступная звестка аб ёй з 1782 года ўдакладняе, што сярод вучняў быў толькі адзін шляхціч.

Першыя звесткі аб пачатковых школах пры касцёлах у Міёрах і Іказні знаходзяцца ў актах праверак парафіяльных школ 1781–1787 гадоў. У Пагосце будынак школы існаваў у 1783 годзе, у 1788 годзе ў парафіяльнай школе вучылася 5 сялянскіх і двое шляхецкіх дзяцей. Апошняя звестка аб ёй 1827 года. Такім чынам магчыма сцвярджаць, што традыцыя адукацыі ў нашым раёне мае 220-гадовую гісторыю. Вучні атрымлівалі навыкі чытання, чыстапісання, іх знаёмілі з асновамі арыфметыкі. Тыя, хто паспяхова заканчваў гэтыя школы, мог паступаць у школы вышэйшага ўзроўню. Некаторыя хлапчукі, атрымаўшы пачатковыя веды, затым ішлі па вёсках «дырэктарамі», несучы ў сялянскія масы пісьменнасць. Увогуле ў XVIII стагоддзі ў Рэчы Паспалітай асвета развівалася бурна, у ёй адбываліся вялікія станоўчыя зрухі. З 1700 да 1773 года колькасць езуіцкіх калегіумаў павялічылася з 58 да 104, а колькасць навучэнцаў толькі ў сярэдніх школах была 30–35 тысяч. Столькі іх мела ў Еўропе толькі Францыя. Дзейнічала 30 школ сярэдніх і 1500 пачатковых.

У апошнія дзесяцігоддзі існавання Рэчы Паспалітай у дзяржаве адбываліся значныя, але непаслядоўныя зрухі да паляпшэння палітычнага і сацыяльна-эканамічнага стану. У ёй 3 мая 1791 года была прынята трэцяя ў свеце пасля ЗША і Францыі канстытуцыя, яшчэ раней (1773 г.) створана другое ў Еўропе пасля Францыі міністэрства адукацыі – Камісія Народнай Адукацыі. Камісія пачала праводзіць школьную рэформу, грунтуючыся на лепшых тагачасных узорах. Паступова школа станавілася свецкай і дэмакратычнай. У ёй згодна з патрабаваннямі часу значнае месца адводзілася дакладным прадметам – фізіцы, хіміі. Была арганізавана падрыхтоўка настаўнікаў, распрацоўваліся новыя падручнікі, звярталася ўвага на грамадзянскае выхаванне. Была рэфармавана і Віленская акадэмія. Яна перайменавана ў Галоўную Школу.

Змены адбыліся і ў школах нашай мясцовасці.

Так школа пры кляштары базыліянаў у Беразвеччы, вядомая з 1773 г., у 1872 годзе мела 3 класы, у наступным – 4, у 1786 годзе ўжо 6 і больш сотні вучняў.

Школа пры кляштары піяраў у Лужках, вядомая з 1745 г., пасля рэформы ў 1782 г. ужо мела 3 двухгадовыя класы са 130 вучнямі. Вывучалі арыфметыку, лацінскую і польскую мовы, прыродазнаўства, геаграфію і гісторыю Рэчы Паспалітай, батаніку, геаметрыю, агародніцтва «хрысціянскую і маральную навуку». Як факультатыўныя прадметы былі французская і нямецкая мовы. Было ў гэтай школе і наватарскае ў тыя часы фізічнае выхаванне.

З 1802 года абавязковы прадмет – руская мова. У 1804 годзе школа стала чатырохкласнай – з пачатковым класам і з двухгадовамі трэцімі і чацвёртымі, навучанне доўжылася 7 гадоў. Сярод прадметаў – логіка, фізіка, гісторыя мастацтваў, паэзія, гістарычнае і эканамічнае права, трыганаметрыя, гісторыя старажытнага Рыма. У навучальным працэсе выкарыстоўваліся пераводы Гарацыя, Авідзія, Цыцэрона, Віргілія і інш. Школьны год цягнуўся 10 месяцаў з трохдзённымі выхаднымі на Каляды, Вялікдзень. 70-80 % вучняў паходзілі з Дзісенскага павета, астатнія ў асноўным з Браслаўскага. Вучоба працягвалася ад 10 нават да 25 гадоў. Вучні паходзілі

ў асноўным са шляхецкіх сем'яў, у выключных выпадках з мяшчанскіх і ўніяцкіх святарскіх. Школа давала на той час высокі ўзровень ведаў. Аб гэтым сведчыць запіс 1816 г, зроблены візітатарам – тагачасным інспектарам: «Хаця ў павеце ёсць яшчэ дзве школы (у Беразвеччы і Дзісне), менавіта да тутэйшай дзяцей сваіх па навуку адсылаюць». Большасць шляхты з тэрыторыі нашага раёна атрымлівала сярэднюю адукацыю менавіта ў ёй. Дзісенскія мяшчане ў мэтах эканоміі часцей усё ж аддавалі сваіх дзяцей у Дзісенскую школу. Дзеці ўніяцкіх святароў у большасці вучыліся ў уніяцкіх духоўных вучэльнях.



На здымку: на паштовай марцы члены Камісіі Народ... кацыі.

Увогуле ў пачатку XIX стагоддзя адукацыя паспяхова развівалася. Дзякуючы спадчыне, пакінутай Камісіяй Народнай Адукацыі, плённай працы куратара Віленскай вучэбнай акругі князя Чартарыйскага і ўжо да гэтага часу падрыхтаванай вялікай плеяды прафесараў і настаўнікаў. У 1820 годзе з васьмі вучэбных акруг у Расійскай імперыі менавіта Віленская пераўзыходзіла ўсе іншыя па колькасці вучняў усіх ступеняў. У сталічнай Маскоўскай акрузе было толькі 287 школ, 846 настаўнікаў і 9788 вучняў, у Віленскай 430 школ, працавалі 983 настаўнікі, якія вучылі 21174 вучняў. У гэты час Беларусь ніяк нельга было ахарактарызаваць «адсталай ускраінай Расійскай імперыі». Аднак сітуацыя хутка пачала мяняцца. Пасля зняцця з пасады куратара князя Чарта-рыйскага новы куратар, знакаміты Навасільцаў перавёў шасцікласныя павятовыя школы ў чатырохкласныя. Вывучэнне лацінскай і польскай моў зменшана да трох гадзін у тыдзень і толькі ў пачатковых класах. Затое навучанне рускай павялічана ва ўсіх класах да 15 гадзін у тыдзень.

У 1832 г. школа ў Лужках была закрыта, а ў 1834 г. згодна распараджэння Блудава была ліквідавана і школа ў Беразвеччы, а замест яе адкрыта духоўная праваслаўная школа. Без адпаведнага нагляду з боку школьнай адміністрацыі нішчыліся і закрываліся пачатковыя парафіяльныя школы. Царская адміністрацыя на «далучаных» землях поўнай хадой вяла разбурэнне і ліквідацыю існаваўшай дагэтуль самай перадавой і моцнай сістэмы адукацыі ў імперыі. У1832 г. быў закрыты Віленскі ўніверсітэт. На працягу 30–50 гг. у Дзісенскім павеце працавалі толькі 4 пачатковыя школы, у тым ліку ў Дзісне з 1835 г. двухкласная, у якой з 1865 г. адкрыўся клас для дзяўчынак.

Згодна паведамлення «Вестника западной России» ў 1866 годзе Дзісенскае вучылішча цярпела недахоп кніг, у прыходскім дзяўчынкі мелі добрыя поспехі ў авалодванні рускай мовай, а яўрэйскае вучылішча было перапоўненым, і ў ім навучэнцы таксама нядрэнна валодалі рускай мовай, на што звярталася найбольшая ўвага.

Менавіта, пачынаючы з 20-х гг. XIX ст., уся Беларусь і наша мясцовасць у прыватнасці ў галіне адукацыі пачалі не проста адставаць, а акунуліся ў вір невуцтва і непісьменнасці.

Наступная хваля разбурэння традыцыйнай сістэмы адукацыі пачалася на Беларусі ў пачатку 60-х гадоў і звязана з М. Мураўёвым. Сама менш былі зачынены 4 гімназіі. У застаўшыхся па губернскіх цэнтрах усталёўваўся жорсткі адміністрацыйны кантроль, уводзіліся пасады наглядчыкаў.

Мураўёў лічыў, што колькасць сярэдніх школ у Віленскай акрузе празмерна вялікая, а школа не выконвае русіфікатарскай функцыі, бо настаўнікі і кіраўнікі гэтых школ – выхадцы з мясцовай шляхты, – выхоўваюць моладзь у духу бунту і рэвалюцыі. Погляды Мураўёва падзяляў куратар Віленскай вучэбнай акругі Карнілаў.

Усе парафіяльныя каталіцкія школы былі кваліфікаваны як «тайныя» і забаронены. Такая «тайная» школа, заснаваная ў Дзісне ксяндзом Юрыем Мачульскім, у якой вывучалі рускую мову і рэлігію, была ліквідавана судовым рашэннем.

У 1864 годзе забараняецца выкладанне ва ўсіх навучальных установах польскай мовы. Ёй нельга было карыстацца нават навучэнцам. Уводзіцца забарона на продаж кніг на польскай мове. А паколькі нешматлікія кнігі на беларускай і літоўскай мовах друкаваліся лацінкай, яны таксама забараняліся. Зразумела, што аб ніякай легальнай адукацыі на беларускай мове не магло ісці гаворкі. А тым часам ужо ў 1835 годзе ў Вільні была надрукавана першая беларуская чытанка, у 1862 годзе ў Варшаве – «Лемантар для добрых дзетак каталікоў» – першы буквар на беларускай мове.

У 1861 годзе царскім урадам справа пачатковай адукацыі была ўскладзена на праваслаўную царкву. За 1862–1863 гады колькасць царкоўных школ у імперыі ўзрасла ў тры разы і дасягнула 21000. Але большасць з іх, не вытрымаўшы канкурэнцыі з свецкімі-земскімі вучылішчамі, хутка закрылася, і праз 10 гадоў іх засталося ўсяго 4000. У нашай мясцовасці ў 1875 годзе дзейнічалі такія школы ў Міёрах (год адкрыцця – 1866), Чэрасах (1863), Лявонпалі (1862), Стэфантоллі (1869), Галомысле (1864), Грыгаравічах (1863), Новым Пагосце (1862), Мілашове (1873). У1866 годзе ў Дзісне была арганізавана двухкласная павятовая, а яшчэ з 1835 года працавала двухкласная парафіяльная школы. Канешне, яны былі пад пільным кантролем царскіх улад і дзейнічалі ў рэчышчы пастаноў Мураўёва.

У 1884 годзе зацвярджаюцца правілы царкоўна-прыходскіх школ. Адначасова царскі ўрад вырашыў зэканоміць грошы на народнай асвеце, абавязаўшы праваслаўных святароў арганізоўваць і кіраваць гэтымі школамі, выдзяляючы мізэрныя сродкі. Напрыклад, у 1916 годзе выдаткоўвалася 60 рублёў у год на школу. Заняткі вялі прычэтнікі. Прыходскі клір успрымаў новаўвядзенні як дадатковае дзяржаўнае ярмо. Такія школы існавалі ў Старым Пагосце, Каўшэлеве, у іншых вёсках.

На царкоўна-прыходскія школы ўскладвалася вельмі патрэбная царызму ідэалагічная роля «воспитывать в детях страх Божий, преподавать им значение веры, вселять в их сердца любовь к святой церкви» і асабліва «преданность царю и отечеству». Веды былі справай другараднай.

Да такой сістэмы адукацыі крытычна ставіліся многія сяляне і прагрэсіўна настроеная частка расійскіх інтэлектуалаў.

Больш грунтоўныя веды давалі валасныя вучылішчы, у якіх настаўнічалі тыя, хто атрымаў хаця б пачатковую педагагічную адукацыю. Такую вучэльню ў Новым Пагосце наведвала 56 дзяцей. Настаўнікам быў тут М. Крывашыя. У год на вучэльню выдзялялася ўрадам 200 і воласцю 23 рублі.

У падполлі працавалі нешматлікія школы з польскай мовай навучання. Скажам, у Дзісне пад шыльдай рамеснай школы дзейнічала пачатковая польская школа Лізаветы Снарскай.

Пасля першай рускай рэвалюцыі беларуская мова была дапушчана ў друк. У 1906 годзе суполкай «Загляне сонца і ў наша ваконца» выдадзены першы беларускі буквар XX ст. у двух

варыянтах – кірыліцай і лацінкай пад назвай «Беларускі лемантар або Першая навука чытання». Аднак беларуская мова па-ранейшаму не дапускалася ў навучальныя ўстановы.

У пачатку XX стагоддзя ў Дзісне рабіліся спробы стварэння прагімназій. У 1890–1902 гадах існавала прагімназія Варвары Дзмітравай і Веры Лявіцкай, а пазней – Пелагеі Навіцкай.

Больш сур’ёзнай навучальнай установай заставалася павятовае вышэйшае чатырохкласнае вучылішча.

У 1917 годзе грамадзянскім камітэтам была арганізавана прыватная гімназія, у якой выкладалася і польская мова як прадмет. Дырэктарам у ёй з’яўляўся Васіль Трушынскі. Гімназія праіснавала да восені 1921 года.

У 1918 годзе падчас нямецкай акупацыі на Беларусі пачала хутка развівацца сетка польскіх і беларускіх школ. У Дзісне заснавалі польскую прагімназію пад кіраўніцтвам Буркгарта. У гэты час на тэрыторыі сучаснага раёна пачалі дзейнічаць і некалькі пачатковых школ з беларускай мовай навучання. Век іх нядоўгі – з усталяваннем польскай улады ўсе яны былі закрытыя.

Стан пісьменнасці і адукацыі ў пачатку XX стагоддзя на беларускіх землях выглядаў вельмі адсталым. Згодна першых дакладных падлікаў у 1921 годзе у Віленскім ваяводстве непісьменных заставалася 38,7 % у гарадах і 59,2 % на вёсцы. У нашай мясцовасці працэнт непісьменных быў яшчэ вышэйшым у 1,5–2 разы. Маючых сярэднюю, а тым больш вышэйшую адукацыю былі адзінкі.